**НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ**




# КАЛІ РАДЗІМА СПЯВАЕЦЦА

**У гродзенскім кніжным выдавецтве «ЛітАРы» пабачыў свет зборнік песень «Родная зямля» на словы Людмілы Кебіч, музыка Ірыны Трацціяк.**

Змест зборніка складаюць дзесяць песенных твораў на беларускай і рускай мовах: «Родная зямля»; «Ой, вясна»; «Незабудки»; «Плач душы»; «Мой Анёл»; «Праглядзела»; «Граница»; «БЛК, 23»; «Гимн «Спектру»»; «Всё потому». Фармат выдання – тэкст плюс нотная партытура.

Зборнік адрасуецца прафесіянальным спевакам, аматарам вакальнага мастацтва, педагогам і кіраўнікам харавых і вакальных калектываў.

Для даведкі

**Трацціяк Ірына Эдуардаўна** – педагог, кампазітар. Шмат гадоў выкладала музычна-тэарэтычныя дысцыпліны і сачыненне музыкі ў Гродзенскім дзяржаўным каледжы мастацтваў. Напісала песні на словы гродзенскіх паэтаў, такіх, як Марыя Цітарчук, Пётр Сямінскі, Алена Марынец, Рыгор Гармаш, Людміла Кебіч і іншых. Творы аўтара гучалі на шматлікіх канцэртных пляцоўках горада, вобласці, Рэспублікі Беларусь. Маладыя выканаўцы бралі з імі ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Жыве і працуе ў Гродне.

**Кебіч Людміла Антонаўна** – паэт, празаік, перакладчык. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі і прозы для дзяцей і дарослых. Цесна супрацоўнічае з беларускімі кампазітарамі. На яе вершы напісана шмат песень, якія ўвайшлі ў песенныя зборнікі (два зборнікі песень Генадзя Кебіча, два зборнікі Валерыя Кручкова). Новы зборнік песень Ірыны Трацціяк на словы Людмілы Кебіч «Родная зямля» ўключае творы розныя па тэматыцы, але аб'яднаныя пачуццём любові да роднай зямлі, свайго горада і людзей.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

www.pisateli.by